УДК 81’373.21 (476.7)

В.М. Босак, д-р с.-г. навук, праф. (БДСГА, г. Горкі);
А.А. Босак, канд. філ. навук, дац. (БДЭУ, г. Мінск)

# НАЗВЫ СВОЙСКІХ І ДЗІКІХ ПТУШАК У ГАВОРКАХ ВЕРХНЯГА НАД’ЯСЕЛЬДЗЯ

На тэрыторыі Верхняга Над’ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) вылучана сем адмысловых гаворак, якія маюць значныя фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя асаблівасці [1–11].

Даследаванне па вызначэнню лексічных асаблівасцей гаворак Верхняга Над’ясельдзя (Пружанскі раён Брэсцкай вобласці і сумежжа) праводзілася ў форме апытвання па спецыяльна распрацаванай праграме, якая ўключала 102 пытанні па лексіцы, у тым ліку па тэматычнай групе “свойскія і дзікія птушкі”. З назвай свойскіх і дзікіх птушак зафіксаваны шэсць лексем: ‘птушка’, ‘бусел’, ‘верабей’, ‘певень’, ‘кураня’, ‘каршун’ [2, 8, 10].

Для абазначэння ‘птушкі’ ўжываюцца словаўтваральныя варыянты: *пту́шка* і *пту́ха*. Найбольш пашырана найменне *пту́ха*. Яно выкарыстоўваецца ў гаворках заходняй, цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй частак рэгіёна. Нарматыўная форма *пту́шка* ахоплівае гаворкі поўначы і паўднёвага захаду Верхняга Над’ясельдзя.

Для абазначэння ‘бусла’ ўжываюцца фанетычныя варыянты: *бу́сел, бу́сёл, бу́сэль, бу́сэнь*. Найбольш пашыранай з’яўляецца нарматыўная форма *бу́сел*. Яна выкарыстоўваецца ў гаворках паўночнай і заходняй частак Верхняга Над’ясельдзя, фанетычны варыянт *бу́сёл* – у гаворках паўднёва-ўсходняй і цэнтральнай частак даследуемага рэгіёна. Варыянты *бу́сэль* і *бу́сэнь* утвараюць мікраарэалы на паўднёвым захадзе Верхняга Над’ясельдзя.

Назва ‘верабей’ ужываецца ў некалькіх фанетычных варыянтах: *вераба́й, вэробэ́й, варабе́й, ворабэ́й /воробэ́й/*, *гарабе́й, гарабэ́й*. Найбольш ужывальнае слова *гарабэ́й,* яно ахоплівае гаворкі цэнтральнай, усходняй і заходняй частак Верхняга Над’ясельдзя.

Для абазначэння ‘пеўня’ існуюць фанетычныя варыянты: *пе́вень, пе́вэнь, пі́вэнь, пэту́х, пяту́х*. Найбольш пашыранай сярод іх выступае назва *пе́вэнь*.

Назва ‘кураня’ існуе ў фанетычных і лексічных варыянтах: *кураня́ /куранё, курэня́, курыня́, курня́/*, *ціпэня́ /ціпеня́, ціпуня́, цыпэня́/*, *ціпленя́ /ціплюня́/*, *ціпушо́к*.

Для абазначэння ‘каршуна’ ў гаворках на ўсёй абследаванай тэрыторыі ўжываецца намінацыя *шуля́к*.

Такім чынам, даследуемыя лексемы ў гаворках Верхяга Над'ясельдзя прадстаўлены нарматыўнымі ў літаратурнай мове і дыялектнымі формамі; у складзе намінацый адзначаны фанетычныя, лексічныя і словаўтваральныя варыянты.

ЛІТАРАТУРА

1. Босак, А.А. Асаблівасці назваў адзення ў гаворках Верхняга Над'ясельдзя / А.А. Босак, В.М. Босак // Общественные и гуманитарные науки. – Минск: БГТУ, 2016. – С. 42.

2. Босак, А.А. Атлас гаворак Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і сумежжа (Верхняга Над'ясельдзя). Лексіка / А.А. Босак, В.М. Босак. – Мінск, 2006. – 124 с.

3. Босак, А.А. Бульба ў гаворках Верхняга Над'ясельдзя / А.А. Босак, В.М. Босак // Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы. – Гомель: ГГТУ, 2009. – С. 264–266.

4. Босак, А.А. Назвы агародніны ў гаворках Верхняга Над'ясельдзя / А.А. Босак, В.М. Босак // Общественные и гуманитарные науки. – Минск: БГТУ, 2017. – С. 79.

5. Босак, В.М. Асаблівасці "лясной тапанімікі" ў гаворках Верхняга Над'ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Общественные и гуманитарные науки. – Минск: БГТУ, 2015. – С. 72.

6. Босак, В.М. Гаворкі Верхняга Над'ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Вестник БГСХА. – 2020. – № 3. – С. 255–258.

7. Босак, В.М. Даследаванне народных гаворак Верхняга Над'ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Общественные и гуманитарные науки. – Минск: БГТУ, 2013. – С. 47.

8. Босак, В.М. З лексікі роднай вёскі (вёска Смаляніца Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці) / В.М. Босак, А.А. Босак // Народныя скарбы. – Мінск, 2008. – С. 31–32.

9. Босак, В.М. Інавацыйныя з'явы ў гаворках Верхняга Над'ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак, Ф.Д. Клімчук // Общественные и гуманитарные науки. – Минск: БГТУ, 2014. – С. 26.

10. Босак, В.М. Лінгвагеаграфічнае даследаванне лексічных асаблівасцей гаворак Верхняга Над'ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Труды БГТУ. Серия 4: Принт- и медиатехнологии. – 2017. – № 1. – С. 91–95.

11. Босак, В.М. Назвы насякомых у гаворках Верхняга Над'ясельдзя / В.М. Босак, А.А. Босак // Общественные и гуманитарные науки. – Минск: БГТУ, 2021. – С. 106–107.